Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ГІДРА-МЭТЭОРОЛЁГІЧНЫ КАМІТЭТ
пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ ГІДРА-МЭТІНСТЫТУТУ

Адрас рэдакцыі: Менск, Шырокая 28. Гідра-мэтэоролёгічны Інстытут. Тэл. 17-93

№ 4 (118) | 1—10 лютага | 1933 г.

ЗЬМЕСТ

Сыноптычны агляд

Сыноптычныя процэсы гэтае дэкады разьвіваліся ва ўмовах значнага паслабленьня сібірскага антыцыклёну, адрог якога распаўсюджваўся да паласы паміж 35⁰—40⁰ усходняй даўгаты, і пры абвастрэньні цыклёнічнасьці на захадзе Эўропы ў выніку моцных прарываў тропічнага паветра з наступным праніканьнем у тыл марскіх арктычных мас праз Скандынавію на Балтыку і Заходнюю трэць эўропейскай тэрыторыі Саюзу.

У сувязі з адзначанымі асаблівасьцямі па эўропейскай тэрыторыі Саюзу к усходу ад 40⁰ усходняй даўгаты на працягу ўсяе дэкады ўтрымліваюцца масы контынэнтальна-арктычнага паветра, якое ўтварае там устойлівы тып маразьлівага надвор'я.

У заходняй трэці эўропейскай тэрыторыі Саюзу і на паўночным захадзе яе, характар надвор'я першае паловы дэкады значна адрозьніваецца ад характару надвор'я астатніх дзён. На працягу першай паловы дэкады на гэтых вучастках назіраецца праніканьне амаль аднастайных порцый марскога палярнага паветра, якія падзяляюцца шэрагам оклюзый старога цыклёну, цэнтр якога досыць марудна прасоўваўся з поўдня Нарвэскага мора на Барэнцава мора.

На працягу другой паловы дэкады ўмовы надвор'я на тых-жа абшарах прымаюць рэзка няўстойлівы характар у выніку ўжо адзначанага абвастрэньня цыклёнічнасьці з хуткімі зьменамі паветраных мас рознага паходжаньня.

Табліца вынікаў мэтэоролёгічных на...

Кліматычны раен	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпэратура паветра																Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Мак-
			1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	—	Сярэдняя	Нормальн.	Максым.	Мінімальн.	Число, калі назіраўся мін.		
(Вазёрны)	2	Дрыса	–3	0	0	–4	–3	0	–4	–6	–6	–1	—	–3	—	2	—	—	88	—
	3	Полацак [1]	–3	0	1	–2	–4	0	–4	–6	–7	–2	—	–3	–7	2	–18	9	85	—
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	/	Нова-Каралёва [23]	–4	–2	0	–4	–8	–2	–5	–7	–8	–5	—	–4	–8	1	–12	5	82	1
(Вадападзельны)	8	Лепель [2]	–3	–1	0	–1	–5	0	–4	–7	–8	–3	—	–3	—	1	–10	8	—	—
	5	Сянно [3]	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	75	Плешчаніцы [4]	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў [5]	–3	1	0	–1	–4	0	–4	–7	–6	–2	—	–3	–7	5	–12	5	86	—
	16	Менск [6]	–2	0	0	–3	–5	1	–4	–8	-10	–1	—	–3	–6	3	–15	5	87	1
	93	Бярэзіна [7]	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка [8]	–1	–3	0	–2	–4	–1	–4	–7	–7	–1	—	–3	–6	2	—	—	87	—
	25	Асіпавічы [9]	–1	1	1	–2	–4	1	–3	–7	–7	–2	—	–4	–7	3	–15	9	86	—
	10	Ворша [10]	–3	–1	0	–3	–8	–2	–5	–6	–7	–4	—	–4	–8	2	–15	5	79	—
	19	Горкі [11]	–3	–1	–1	–4	–9	–3	–5	–7	–6	—	—	–4	–8	1	–18	5	85	1
(Раўнінны)	89	Клічаў [12]	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	119	Ратміравічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	30	Мар.-Сосны [13]	0	1	1	0	–1	–1	–3	–7	–9	0	—	–2	–6	2	–15	9	73	—
	21	Магілеў [14]	–3	–1	1	–3	–9	–2	–4	–6	–8	–4	—	–4	–7	2	–16	5	81	—
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў [15]	–2	–1	0	–3	–9	–3	–4	–6	–7	–6	—	–4	–8	2	–15	5	—	—
	71	Касьцюковічы [16]	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск [17]	–2	0	–1	–2	–8	–1	–4	–6	–9	–4	—	–4	–7	2	–16	5	79	4
	32	Жлобін [18]	–1	1	0	–2	–7	–2	–3	–5	–8	–3	—	–4	–7	3	—	—	—	—
(Нізінны)	33	Жыткавічы [19]	1	1	1	1	0	2	–2	–7	–8	0	—	–1	–5	3	–14	9	76	—
	37	Калінкавічы [20]	0	1	1	–2	–4	0	–1	–8	–8	–3	—	–2	–6	3	–14	9	75	—
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск [21]	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	83	Барба [22]	–1	0	0	–2	–6	–4	–2	–6	–7	–7	—	–3	—	2	–15	5	—	—
	38	Гомель [23]	–1	0	0	–1	–7	–2	–2	–8	–7	–5	—	–3	–7	3	–16	9	—	—
	35	Васілевічы [24]	–1	1	1	–1	–5	–1	–2	–6	–7	–3	—	–2	–6	3	–13	5	74	—
	40	Людвінава [25]	0	1	1	–2	–2	–1	–2	–5	–7	–4	—	–2	–6	3	–14	5	75	—
	242	Красілаўка	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—

ВАГІ: [1] туман (5); галалёд (4); [2] туман (10); [3] туман (1, 2); [4] туман (6); [5] туман (5, 6); [6] мяцель (10 ... 6, 10 ... туман (1, 4, 5, 6, 7); [7] туман (5, 6); [8] туман (8), галалёд (6); [9] туман (1, 2, 4, 5, 6, 7), мяцел... ман ... (6, 9); [10] туман (7), мяцель (10); [11] туман (1, 5), галалёд (8), ізмаразь (1, 2, 4, 5), мяцель (2, ... (6, 1... 6, 9); [12] туман (1); [13] туман (6); [14] мяцель (2, 10), туман (5); [15] туман (3, 5), мяцель (...

ых назіраньняў за 1—10 лютага 1933 г.

Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Тэмпература на паверхні глебы: Макс.	Мінім.	Число, калі на гл. мін.	Ападкі ў м. м.: 1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	—	Сума	Сьнегавы насьціл: Вышыня ў см.	Шчыльнасьць	Характарыстыка паверхні сьнегавога насьцілу
88	—	—	—	..	1.0	..	..	2.0	..	..	..	3.0	1.0	—	7.0	11	—	наст.
85	—	—	—	..	7.0	0.5	..	5.0	4.0	0.5	0.1	..	14.0	—	31.1	14	0.23	наст.
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	..	5.0	1.0	..	..	8.0	1.0	0.1	..	9.0	—	24.1	23	—	роўнамер. без аглен. месц.
82	1	—12	5	0.3	6.0	0.2	..	2.0	6.0	..	..	..	9.0	—	23.5	26	0.17	"
—	—	—	—	1.0	0.1	5.0	2.0	..	3.0	3.0	0.3	..	5.0	—	19.4	8	—	роўн. без аг. мес
—	—	—	—	..	5.0	..	..	2.0	4.0	..	0.2	2.0	7.0	—	20.2	11	—	"
—	—	—	—	1.0	5.0	1.0	0.1	4.0	1.0	0.1	..	0.5	2.0	—	14.7	13	—	наст.
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
86	—	—	—	1.0	7.0	1.0	0.2	6.0	3.0	0.1	..	0.6	11.0	—	29.9	15	0.19	роўн. без аг. мес
87	1	—16	8	0.4	7.0	1.0	0.1	8.0	1.0	0.6	..	1.0	5.0	—	24.1	15	0.22	наст.
—	—	—	—	0.1	11.0	0.1	0.4	1.0	6.0	0.1	0 2	—	—	—	—	16	—	"
87	—	—	—	1.0	?	..	0.5	..	2.0	..	..	..	2.0	—	—	12	—	няроўн. з аг. ме
86	—	—	—	0.1	8.0	1.0	..	6.0	0.2	..	..	1.0	10.0	—	26.3	16	0.18	"
79	—	—14	5	0.1	6.0	1.0	..	..	3.0	8.0	..	..	0.1	8.0	26.2	11	0.16	"
85	1	—19	5	0.4	5.0	1.0	0.2	1.0	10.0	..	..	0.3	11.0	—	28.9	16	0.22	сумёты
—	—	—	—	0.3	6.0	11.0	0 1	3.0	1.0	0.1	1.0	1.0	2.0	—	25.5	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
73	—	—	—	..	0.4	0.1	..	4.0	5.0	..	..	..	2.0	—	11.5	2	—	няроўн. з аг. мес
81	—	—	—	0.6	5.0	1.0	..	1.0	7.0	..	..	..	9.0	—	23.6	18	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	1.0	7.0	1.0	1.0	1.0	11.0	..	..	0.1	14.0	—	36.1	20	—	роўн. без аг. мес
—	—	—	—	3.0	6.0	1.0	0.1	0.4	11.0	0.1	..	0.1	15.0	—	36.7	33	—	сумёты
79	4	—	—	1.0	2.0	..	..	0.4	5.0	..	..	..	4.0	—	12.4	23	0.20	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
76	—	—	—	..	5.0	0.4	0.1	7.0	3.0	..	..	..	5.0	—	20.5	10	0.15	наст.
75	—	—	—	0.1	4.0	0.3	0.4	2.0	5.0	..	..	..	1.0	—	12.8	11	0.28	"
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	2.0	9.0	0.3	0.2	2.0	13.0	..	..	..	13.0	—	39.5	26	—	—
—	2	—12	10	1.0	5.0	..	..	..	6.0	..	0.2	0.3	5.0	—	17.5	—	—	—
—	—	—	—	2.0	6.0	1.0	0.1	0.3	12.0	0.2	..	..	3.0	—	24.6	—	—	—
74	—	—	—	0.4	4.0	0.4	0.2	1.0	6.0	..	..	..	0.5	—	12.5	15	0.20	роўн. без аг. мес
75	6	—13	10	1.0	4.0	0.5	0.3	0.4	6.0	0.2	0.1	..	3.0	—	15.5	9	—	"
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—

6, 10); [16] туман (1, 5); [17] мяцель (2, 6, 10), туман (5), галалёд (7); [18] мяцель (7), туман (14; [19] туман (1, 6), паземак (5), галалёд (10); [20] мяцель (10), туман (9), ізмаразь (5); [21] туман (5), мяцел (6, 10); [22] туман (3); [23] мяцель (2, 6, 10); [24] мяцель (10); [25] туман (5), мяцель (10).

Табліца вынікаў мэтэоролёгіч. назіраньняў за 1—10 лютага 1933 г.

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы: Напрамак	Вецер: Пераважаючы: Хуткасьць	Вецер: З максым. хуткасьцю: Напрамак	Вецер: З максым. хуткасьцю: Хуткасьць	Інсоляцыя ў %%	Сярэдняя воблачнасьць у 10-ці балавай сыстэме: Агульная	Сярэдняя воблачнасьць у 10-ці балавай сыстэме: Ніжняя	Сярэдні стан павярховага пласту глебы (на глыбіні 10—15 см)
I Паўночны (Вазёрны)	2	Дрыса	S	6	S	12	—	8	7	замерзш., заслан. сьнегам
	3	Полацак	S	4	S	14	—	>9	>9	замерзш., заслан. сьнегам
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	замерзш., заслан. сьнегам
	7	Новае-Каралёва	S	6	S	16	2	9	8	замерзш., цьвёрдая і сухая
II Пераходны (Вадападзельны)	8	Лепель	SW	4	S	12	—	>9	8	замерзш., заслан. сьнегам
	15	Сянно	—	—	—	—	—	—	—	"
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	"
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	SW	4	S	9	—	9	9	замерзш., заслан. сьнегам
	16	Менск	E	4	S	6	—	9	8	"
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	"
	23	Мар'іна-Горка	W	6	S	—	—	9	8	"
	25	Асіпавічы	S	4	S	9	—	10	10	"
	10	Ворша	S	4	S	12	—	9	7	"
	19	Горкі	S	4	S	9	—	9	9	"
III Цэнтральны (Раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	замерзш., заслан. сьнегам
	28	Слуцак	—	—	—	—	—	—	—	—
	119	Ратміравіча	—	—	—	—	—	—	—	—
	30	Мар'іна-Сосны	W	4	W	6	—	8	7	—
	21	Магілеў	S	4	S	9	—	8	7	замерзш., заслан. сьнегам
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	S	4	N	9	—	9	9	замерзш., заслан. сьнегам
	71	Касьцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	"
	31	Турск	S	4	S	9	—	8	7	"
	32	Жлобін	S	—	S	—	—	10	10	—
IV Паўночны (Нізінны)	33	Жыткавічы	SW	4	W	6	—	8	7	замерзш., заслан. сьнегам
	37	Калінкавічы	E	4	SW	9	—	8	7	замерзш., заслан. сьнегам
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чэчэрск	—	—	—	—	—	—	—	замерзш., заслан. сьнегам
	83	Барба	SE	4	S	14	—	9	9	замерзш., цьвёрдая і сухая
	38	Гомель	SW	4	SW	9	—	9	9	замерзш., заслан. сьнегам
	35	Васілевічы	SW	4	SW	12	6	8	7	"
	40	Людвінава	S	4	S	9	—	9	8	—
	242	Красілаўка	—	—	—	—	—	—	—	—

Наяўнасьць моцных цёплых плыняў праз Заходнюю Эўропу мела сувязь з вельмі разьвітым Азорскім адрогам, найвялікшае распаўсюджваньне якога на ўсход прыпадае на сярэдзіну дэкады.

Па тэрыторыі БССР на працягу першых чатырох дзён прасоўваецца марское полярнае паветра, якое яшчэ застаецца досыць цёплым.

З шэрагам унутрымасавых падзелаў зьвязаны ападкі найбольш значныя 2-га і 3-га числа. Увесь гэты час пераважаюць паўднёвыя і заходнія вятры пры пахмурным небе.

З 5-га пачынаецца тыпова няўстойлівае надвор'е. У гэты дзень на басэйн Дняпра з паўднёвага захаду пранікаюць масы контынэнтальна-полярнага паветра, у якіх адбываецца антыцыклёногенэз. Пры радыяцыйным ахаладжэньні гэтага паветра тэмпэратурнае ваганьне адбываецца яшчэ больш рэзка. У наступны дзень з захаду ізноў уваходзіць марское полярнае паветра, якое дае пацяпленьне пры павялічэньні воблачнасьці. Сьнегапад, узмацненьне вятроў і мяцеліцы ў гэты дзень адбываюцца ў выніку ўтварэньня хваляваньняў на фронтальным падзеле.

7-га ў тыл хваляваньню пачынае распаўсюджвацца марское арктычнае паветра, якое да гэтага часу пранікла ў Прыбалтыку. Прасоўваньне халоднага фронту ўперадзе марскіх арктычных мас адбываецца пры выпадзеньні ападкаў і паўночных вятрах.

У наступныя два дні марскія арктычныя масы працягваюць займаць краіну. На захадзе Эўропы ў гэты час адбываецца больш моцны прарыў тропічнага паветра.

Плынь гэтых мас жывіць новы цыклён з цэнтрам ў Норвэскім моры і накіроўваецца к усходу.

У апошні дзень гэтая плынь дасягае нашай краіны, у сувязі з чым адбываецца рэзкае пацяпленьне. Фронтальныя ападкі ў выглядзе сьнегападу пératвараюцца ў дождж пры пераходзе тэмпэратуры праз нуль.

Л. Садоўскі.

Мэтэоролегічная характарыстыка за 1—10 лютага 1933 г.

Тэмпэратура ў гэтай дэкадзе значна хісталася і некалькі разоў пераходзіла праз 0°. У першы дзень т-ра, падвышаючыся з поўначы на паўднёвы захад, зьмяняецца ад —3 да +1°. Да 3-га ідзе падвышэньне т-ры да 0° і 1° па ўсёй БССР. На працягу наступных 2-х дзён т-ра падае, прычым асабліва нізкіх значэньняў яна дасягае на ўсходзе па лініі Гомель—Ворша. 6-га т-ра ізноў падвышаецца і мясцамі робіцца нават вышэй нуля, але ў наступныя дні наглядаецца зьніжэньне да —7° і нават да —9° к 9-му числу. У апошні дзень адзначаецца ўздым т-ры асабліва значны на захадзе БССР, дзе мясцамі т-ра дасягае 0°.

У сярэднім за дэкаду т-ра хістаецца ад —2 да —4° і перавышае нормальную на 3-4°. Максымальная т-ра дасягала 2-3° (у Барысаве нават 5°). Мінімальная т-ра хісталася каля —15°.

Ападкі наглядаліся ў даволі значнай колькасьці ўсю дэкаду. Асабліва значны сьнегапад быў 2-га чысла, калі выпала да 10 мм. ападкаў. Далей значныя сьнегапады былі 5-га і 6-га. У апошні дзень па ўсёй БССР наглядаліся значныя ападкі ў выглядзе дажджу, якія мясцамі перавысілі 10 мм. Сумы ападкаў за дэкаду хісталіся ў большасьці ад 20 да 30 мм.

Сьнегавы насьціл значна павялічыўся ў параўнаньні з папярэдняй дэкадай, асабліва на ўсходзе тэрыторыі, дзе ня было такіх значных хістаньняў т-ры, як на захадзе. Вышыня яго хісталася ад 15 да 20 см, а мясцамі нават перавышала 20 см. Шчыльнасьць таксама павялічылася ў выніку адліг і мясцамі на паверхні сьнегу наглядаецца лёдавая скарынка. Некалькі разоў на працягу дэкады адзначаны мяцеліцы. Вятры пераважалі паўднёвыя і паўднёва-заходнія. Сярэдняя хуткасьць іх умераная, але часам дасягала даволі значных вялічынь 14—16 м/сэк.

Воблачнасьць хісталася ад 80 да 100% агульнага пакрыцьця неба. Наогул трэба сказаць, што надворь'е ўвесь час было пахмурнае, вільготнае, нават сырое, і хутчэй цёплае, чымся халоднае. Дняўныя адлігі чаргаваліся з начнымі пахаладаньнямі.

Н. Малішэўская.

Кіруючыя паказаньні

У бліжэйшы час па мэтэаролёгічных станцыях II разраду будуць разасланы новыя табліцы мэтэаролёгічных назіраньняў.

Гэтыя табліцы адрозьніваюцца ад ранейшых тым, што ў іх маюцца наступныя дадатковыя графы:

1. Лік дзён з адноснай вільготнасьцю $\geqslant 5$ і $\geqslant 20$. Днямі з адноснай вільготнасьцю, якая менш або раўна 50% (або адпаведна 20%), трэба лічыць усе тыя дні, калі хоць у адзін з тэрмінаў назіраньняў (за 7 г., 13 г. ці 21 г.) — адносная вільготнасьць была 50% або менш (адпаведна 20% або менш).

2. Лік дзён з тэмпэратураю $\geqslant 0$, $\geqslant 5$, $\geqslant 10$, $\geqslant 25$, $\geqslant 30°$. Днямі з тэмпэратураю, якая больш або раўна 0°, трэба лічыць ўсе тыя дні, калі максымум за суткі па максымальным тэрмомэтры быў вышэй або раўны 0°.

Днямі з тэмпэратураю, якая больш або роўна 5°, калі максымум быў вышэй або роўны 5° і г. д.

3. Лік дзён са * (са сьнегам) пры колькасьці ападкаў за суткі $\geqslant 0.1$ мм. и $\geqslant 0.5$ мм.

У графу „лік дзён са сьнегам пры ападках $\geqslant 0.1$ мм" увойдуць усе дні *са сьнегам,* калі колькасьць ападкаў за гэтыя суткі была больш або роўна 0.1 мм. (незалежна ад таго—ці быў, апроч сьнегу, адзначан яшчэ які-небудзь другі від ападкаў—напрыклад дождж, крупа, ізмаразь і г. д. [1]).

У графу „лік дзён са сьнегам пры ападках 0.5 м." усе дні са сьнегам, калі колькасьць ападкаў за суткі—была больш, або роўна 0,5 мм.

---

[1]) Прычым, калі ў які-небудзь дзень быў сьнег і яшчэ іншы від ападкаў, дык даны дзень таксама ўлічваецца, як дзень з гэтым другім відам ападкаў.

4. Лік дзён са [*] (сьнегавым насьцілам). Днямі са [*] (сьнег. насьцілам)—належыць лічыць усе тыя дні, калі каля 7 гадз. раніцы ўся бачная (адчыненая) ваколіца або па крайняй меры больш яе паловы—пакрыта сьнегам (хоць і няроўнамерна).

5. Уводзіцца больш дэталёвая разьбіўка ападкаў па межах А іменна трэба даваць лік дзён з ападкамі:

0 1 мм і больш (≥0.1 мм).
0.5 мм і больш (≥0.5 мм).
1.0 мм і больш (≥1.0 мм).
5.0 мм і больш (≥5.0 мм).
10.0 мм і больш (≥10.0 мм).
20.0 мм і больш (≥20.0 мм).

6. На 2-ой старонцы табліцы маецца графа „папраўка барометра“. Гэту графу запаўняць ня трэба, бо яна будзе запаўняцца пры апрацоўцы табліцы ў Гімэіне.

М. Міціна.

Ва што-б то ні стала дабіцца сваечасовай прысылкі месячных табліц асноўных назіраньняў!

У студзені месяцы Гімэінам па сетцы мэтстанцый II-га разраду быў разаслан абежнік, у якім прапанавалася абавязковая адсылка асноўных назіраньняў не пазьней 2-га чысла наступнага за справаздачным месяцам.

Наступная зводка паказвае, што сетка цалкам яшчэ не дабілася 100% выкананьня гэтага заданьня.

Так, Гімэін атрымаў асноўныя назіраньні (і сьнег. насьціл):

2-га ліку ад мэтстанцый:	Асіповічы, Зазер‘е, Менск Апорная, Негарэлае.
3-га „ „	Барысаў, Бычыха, Мар‘іна-Горка.
4-га „ „	Асінторф, Віцебск, Ворша гор., Горкі, Жлобін, Жыткавічы, Калінкавічы, Людвінава, Магілеў чыг., Турск.
5-га „ „	Васілевічы, Ворша чыг., Гомель, Н. Каралёва, Полацак, Стара-Барысаў.
7-га „ „	Бабічы, Лельчыцы, Мар‘іна-Горкі, Скрыгалава, Слуцк (па Слуцку без назіраньняў па сьнег. насьціле), Чэрыкаў.
8-га „ „	Менск Бал. Ін-тут.
9-га „ „	Сіроціна.

Не даслалі назіраньняў (на 13/II) Дрыса, Крычаў, Лепель, Стукачова.

Прыведзеныя лічбы пры прыняцьці пад увагу адлегласьці мэтстанцый ад Менску паказваюць, што ёсьць магчымасьць мець паміж 2—4 чысламі матар‘ял з усіх мэтстанцый, і, калі гэтага мы ня маем, дык толькі па віне мэтстанцый.

Апрацоўка назіраньняў у Гімэіне вядзецца ня толькі па кожнай мэтэаролёгічнай станцыі паасобку, але з адначасовым

аглядам назіраньняў цэлай групы станцый, а таму несваечасовае атрыманьне матар'ялу ад аднэй якой-небудзь станцыі—прымушае або адкласьці апрацоўку цэлага раду станцый або паўтарыць у значнай частцы ўжо праробленую працу.

Так, мэтэаролёгічная станцыя Крычаў, якая сыстэматычна затрымлівае дасылку назіраньняў, прымушае штомесячна рабіць лішнюю працу.

Наогул яшчэ несваечасова паступаюць назіраньні па самапісцах. Дасылка іх прапануецца не пазьней 8-9 чысла, але, зразумела, гэты тэрмін адносіцца да тых станцый, якія робяць апрацоўку істужак. Тыя-ж, якія яе пакуль яшчэ ня робяць, ня маюць падставы для затрыманьня іх дасылкі.

Неабходна падкрэсьліць, што патрабаваньне здачы на пошту асноўных назіраньняў не пазьней 2-га чысла ні ў якім выпадку ня можа зьніжаць якасьць дасылаемых месячных табліц.

Мэтстанцыя павінна весьці апрацоўку кніжак запісаў назіраньняў на працягу ўсяго месяца, запаўняючы месячную табліцу штодзенна (апроч мінімальнай тэмпэратуры, якая ўносіцца ў табліцу па сканчэньні месяца, калі атрымліваецца дадатковая папраўка да паказаньняў штыфтыка), ітогі і праверку рабіць па дэкадах. Тады 1-га чысла мэтстанцыя будзе мець дастаткова часу, каб закончыць месячныя вынікі і правесьці добры кантроль складзеных табліц.

М. Міціна.

З загаду № 8 па Гімэіну ад 9.II.33 г.

Загадчыкам мэтстанцый: Дрыса—т. Гассюлю А., Крычаў—Вясёлка С., Сіроціна—т. Поппэ К., Стукачова—т. Будынскай В., Скрыгалава—т. Радзевічу В. і Чэрыкаў—т. Дуброўскай Е. за несваячасовую дасылку ў Гімэін матэрыялаў асноўных назіраньняў за студзень 1933 г.—аб'явіць вымову.

Дырэктар Гімэіну Лейвікаў.

Адказны рэдактар М. Л. Лейвікаў.

Менск. Друкарня БАН. Зак. № 43.7. Гарліт № 1435. Тыр. 1000 экз. 8 старо.